УДК 025.5:004.9

***С. В. Зыгмантовіч,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці;*

***В. І. Саітава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

# РЭКАМЕНДАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БІБЛІЯТЭК У ЛІЧБАВЫМ АСЯРОДДЗІ

**Анатацыя.** Разглядаюцца пытанні трансфармацыі рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк ва ўмовах лічбавых камунікацый. Змены адбываюцца ў фарматах прадстаўлення крыніц рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі, іх жанрах, метадычных прыёмах рэкамендацыі дакументаў, зносінах з карыстальнікамі, інфраструктуры рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Сярод стваральнікаў і пастаўшчыкоў рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі і паслуг звяртаецца ўвага на суб'ектаў выдавецкай, кнігагандлёвай сфер, навуковай папулярызацыі. Вызначаюцца перавагі прапануемых імі рэкамендацыйных бібліяграфічных сервісаў у лічбавым асяроддзі. Абгрунтоўваюцца кірункі развіцця бібліятэчнай рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў Беларусі ў новых інфармацыйна-тэхналагічных умовах.

**Ключавыя словы:** рэкамендацыйная бібліяграфія, рэкамендацыйныя бібліяграфічныя сервісы, бібліятэкі, выдавецтвы, кнігагандлёвыя арганізацыі, навуковая папулярызацыя, лічбавыя камунікацыі.

***S. Zygmantovich,***
*PhD in Pedagogy, Associate Professor, Professor of the Department of Information and Analytical Activities;*

***V. Saitova,***
*PhD in Pedagogy, Associate Professor, Professor of the Department of Information and Analytical Activities of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

# RECOMMENDATION AND BIBLIOGRAPHY ACTIVITIES OF LIBRARIES IN THE DIGITAL ENVIRONMENT

**Abstract.** The article deals with issues of transformation of library-recommendation and bibliographic activity in the conditions of digital communications. Changes occur in the presentation formats of sources of

recommended bibliographic information, their genres, methodical methods of recommending documents, communication with users, infrastructure of recommended bibliography. Among the creators and suppliers of recommended bibliographic information and services, attention is paid to subjects of the publishing sphere, book trade, scientific popularization. The article defines the advantages of the bibliographic services offered by them in the digital environment and substantiates the directions of development of the library reference bibliography in Belarus in the new information and technological conditions.

**Keywords:** recommended bibliography, recommended bibliographic services, libraries, publishers, book trade organizations, scholarly popularization, digital communications.

Рэкамендацыйная бібліяграфія, вытокі існавання якой вядуцца з далёкіх часоў, калі кніга і чытанне зрабіліся крыніцай атрымання ведаў і навучання падрастаючага пакалення, карыснага і цікавага правядзення вольнага часу, прайшла вялікі шлях, пашыраючыся тэрытарыяльна і арганізацыйна, змяняючы фарматы і метадычныя прыёмы прадстаўлення дакументаў. Стваральнікі і спажыўцы рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі фарміравалі інфраструктуру гэтага віду бібліяграфічнай дзейнасці, якая змянялася пад уплывам многіх грамадскіх фактараў і гістарычных умоў. Але каштоўнасна-арыентацыйная сутнасць рэкамендацыйнай бібліяграфіі інварыянтная. Сярод іншых відаў бібліяграфіі рэкамендацыйная адрозніваецца самай тонкай настроенасцю на сацыяльныя працэсы і гуманістычныя мэты, унікальным веданнем кніжнага свету і самай глыбокай увагай да кнігі і асобы чытача. Толькі ў сегменце бібліятэчнай рэкамендацыйнай бібліяграфіі выбар чытачом кнігі, яе вусная ці дакументальна зафіксаваная прапанова выпрацавалі прафесійныя веды, якія з'яўляюцца для бібліятэкара адпраўным пунктам зносін з чытачамі. Змест, сюжэты, жанры, аўтары, асобы, геаграфічныя аб'екты, разнастайныя каштоўнасныя ўласцівасці дакументаў з'яўляюцца свайго роду хэштэгамі, на аснове якіх бібліятэкар дае чытачу патрэбную бібліяграфічную інфармацыю ў разнастайных фарматах і жанрах: ад капітальных рэкамендацыйных бібліяграфічных крыніц да распрацоўкі індывідуальных праграм чытання ці адзінкавай парады кнігі падчас размовы з чытачом.

Эпоха лічбавай камунікацыі карэнным чынам змяніла ўмовы ажыццяўлення рэкамендацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці.

Бібліятэчная рэкамендацыйная бібліяграфія трансфармуецца як на ўзроўні доступу да яе рэсурсаў, так і на ўзроўні абслугоўвання карыстальнікаў, сярод якіх шмат віртуальных. Хуткае ўкараненне лічбавых тэхналогій ідзе побач з развіццём афлайн-рэкамендацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках. Працягвае з'яўляцца мноства друкаваных рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў розных жанраў і тыпаў, але электронныя версіі такіх бібліяграфічных прадуктаў, або першапачаткова створаныя як электронныя, ужо перайшлі ў ранг традыцыйных. Асновы вербальных зносін з чытачамі раскрываюцца ў прынцыпах стварэння рэкамендуемых кніжных сервісаў. Важна ўлічваць, што пераход на лічбавыя мадэлі і сервісы не толькі трансфармаваў інфраструктуру рэкамендацыйнай бібліяграфіі, якасна змяніў яе прадукты, стварыў вялікую разнастайнасць выбару і доступу для карыстальнікаў, але і паставіў перад бібліятэкамі новыя задачы [1–3].

Для бібліятэк сталі вельмі важнымі вытворцы рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі такіх сфер, як выдавецкая, кнігагандлёвая, навуковай папулярызацыі. У мінулым ствараемыя выдаўцамі і кнігагандлярамі бібліяграфічныя дапаможнікі мелі абмежаваную функцыянальную каштоўнасць у кантэксце бібліятэчных працэсаў, напрыклад, у якасці крыніцы камплектавання. У цяперашні час суб'екты названых сфер з'яўляюцца буйнейшымі пастаўшчыкамі рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі і паслуг, з характэрнай рысай бескантактавага ўзаемадзеяння з карыстальнікамі. Класічны метад рэкамендацыі кніг для ўсіх чытачоў ці мэтавых груп, заснаваны на лічбавых тэхналогіях і штучным інтэлекце, даў карыстальнікам новыя магчымасці выбару розных інфармацыйных аб'ектаў: практычна з любога месца, рознага тыпу, з прамым доступам да кантэнту. Спецыялізаваныя кампаніі, установы ў вышэйзгаданых сферах прапануюць і забяспечваюць публічныя бібліятэкі вялізнымі масівамі інфармацыйных аб'ектаў, якія лёгка ўспрымаюцца інструментамі для чытання (прагляду, праслухоўвання), даступнымі карыстальнікам пры ўмове падпіскі бібліятэкі. Чытачам (гледачам, слухачам) прапануюцца рэкамендацыйныя анатацыі, вокладкі кніг, рэйтынгі, указанні жанраў, тэматычных раздзелаў, спісы і іншыя матэрыялы для арыентацыі і выбару. Бібліятэкі сталі прывабным сегментам для прамоцыі прадуктаў лічбавых дыстрыб'ютараў, і з

боку бібліятэчных спецыялістаў, калі развіваюцца такія напрамкі, важна крытычна ацэньваць пастаўшчыкоў інфармацыі і ўмовы прадастаўлення кантэнту. Пры гэтым бібліятэкі таксама ўлічваюць якасць рэкамендацыйнага бібліяграфічнага забеспячэння дакументных патокаў, узроставае ранжыраванне і тэматыку спісаў, якія прапануюцца (і аператыўна абнаўляюцца), прагназуючы актыўнасць звяртання карыстальнікаў.

Прыкладам могуць быць OverDrive, Ingram Content Group, Hoopla і многія іншыя пастаўшчыкі лічбавых прадуктаў, якія ўстанавілі партнёрскія сувязі з вялікай колькасцю бібліятэк у розных краінах. Прывабнасць для карыстальнікаў памнажае магчымасць сачыць за абнаўленнямі кантэнту ў партнёрскіх бібліятэках праз YouTube, Facebook, Instagram і іншыя сацыяльныя сеткі. У Беларусі цяпер гэты канал рэкамендацыйнай бібліяграфіі не атрымаў істотнага распаўсюджвання ў параўнанні з абслугоўваннем бібліятэк лічбавым кантэнтам, уключаючы бібліяграфічны, для мэт навукова-даследчай дзейнасці.

Для выказвання пачуццяў агульнасці і асабістай актыўнасці, якія аб’ядноўваюць аматараў кнігі ў сацыяльных сетках, асаблівыя ўмовы ўтвараюцца ў рэкамендацыйных кніжных сервісах (за мяжой выкарыстоўваецца і паняцце «сайты сацыяльнай каталагізацыі»). Пастаўшчыкі такіх паслуг (прафесіяналы розных сфер) і аматары чытання ствараюць мегакніжныя сістэмы, рэкамендацыйна-бібліяграфічны інструментарый якіх настроены на рэалізацыю разнастайных форм праяўлення чытацкай актыўнасці, чытацкага ўзаемадзеяння і персаналізаваную параду кніг.

Падпісчыкі буйнейшага сусветнага рэкамендацыйнага кніжнага сервісу Goodreads могуць размяшчаць кнігі на свае асабістыя кніжныя паліцы, ацэньваць іх і пакідаць водгукі, бачыць, што чытаюць іх сябры і аўтары, удзельнічаць у дыскусійных форумах і групах па розных тэмах, атрымліваць прапановы аб будучых варыянтах чытання, каментаваць кніжныя паліцы і агляды сяброў, калі дадалі іх у свой профіль і інш. Goodreads мае рэйтынгавую сістэму ад адной да пяці зорак з магчымасцю суправаджаць рэйтынг пісьмовым водгукам.

Варта падкрэсліць, што буйнейшыя выдавецкія і кнігагандлёвыя кампаніі імкнуцца да набыцця правоў на гэтыя рэсурсы, ацэньваючы вялікую колькасць карыстальнікаў.

У інфраструктуры сучаснай рэкамендацыйнай бібліяграфіі для бібліятэк важна бачыць і выкарыстоўваць рэсурсы каналаў навуковай папулярызацыі. Перадавыя навукоўцы заклапочаны пагрозамі падзення каштоўнасці навуковых ведаў сярод вялікіх супольнасцей людзей, ростам даверу да фэйкаў, інфармацыйнага «забруджвання» інтэрнэту і сацыяльных сетак. З сайта ПостНаука вучоныя звяртаюцца з заклікам: «Поддержите нас в деле просвещения» [4]. Пакуль цяжка аднесці бібліятэкі да стэйкхолдараў гэтага выдатнага праекта (ці іншых, якія выконваюць падобную сацыяльную ролю), аднак бібліятэчным спецыялістам варта з увагай паставіцца да рэкамендацыі кніг, якія даюцца на яго сайце, распачаць дзеянні для іх прадстаўлення ў чытацкім асяроддзі.

У дзейнасці беларускіх бібліятэк узмацняецца тэндэнцыя да прапаганды навуковых ведаў. Калі для навуковых бібліятэк мэтазгодным арыенцірам з’яўляецца падтрымка адкрытай навукі, адкрытага доступу да публікацый, да адкрытых даных, то публічныя і іншыя бібліятэкі, дзейнасць якіх канцэнтруецца на павышэнні якасці жыцця людзей як выніку далучэння да каштоўнасцей навукі і культуры, прыярытэтам лічаць папулярызацыю навуковых, у тым ліку краязнаўчых ведаў. Прыкладам можа быць курс лекцый «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» (праект Віцебскай абласной бібліятэкі з партнёрамі – кафедрай гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, клубам гістарычнай рэканструкцыі «Vargentorn» і Віцебскім гарадскім парталам). Лекцыі, кансультацыі вучоных і спецыялістаў, фота і відэа суправаджаюцца рэкамендацыйнымі бібліяграфічнымі спісамі. Праект выклікаў значную цікавасць. Лекцыйныя і бібліяграфічныя матэрыялы даступны на сайце і старонцы бібліятэкі ВКонтакте.

Значным напрамкам выкарыстання новых інавацыйных магчымасцей лічбавай трансфармацыі, у тым ліку ў рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці, з’яўляецца выкарыстанне патэнцыялу манапольных або мегапольных і, у прыватнасці, нацыянальных кніжных платформ, якія аб’ядноўваюць мноства інфармацыйных рэсурсаў краіны і забяспечваюць доступ да іх у аддаленым рэжыме. Гэта актуалізуе запыт на стварэнне адзінага рэкамендацыйна-бібліяграфічнага апарату і выкарыстанне

разнастайных рэкамендацыйна-бібліяграфічных інструментаў, што будуць зручнымі і карыснымі для ўсіх суб’ектаў кніжнай культуры, у тым ліку бібліятэк, розных катэгорый спажыўцоў інфармацыі, незалежна ад таго, якую інфармацыю яны жадаюць атрымаць пры выкарыстанні платформы. Вывучэнне вопыту замежных краін, у прыватнасці Канадскай кніжнай платформы BookNet Canada (https://www.booknetcanada.ca) і прапанаванага ёю набору прадуктаў і інструментаў, у тым ліку спецыяльна прызначанага для бібліятэк: штотыднёвыя абнаўленні спісаў кніг, якія найбольш прадаюцца ў краіне; доступ да папярэдняга кантэнту, кансультатыўны інструмент для чытачоў і бібліятэкараў – рэкамендацыйныя спісы лепшых прапаноў (Loan Stars, Loan Stars Jn і інш.), дазваляе ўбачыць перспектыўнасць гэтага напрамку для іншых краін, у тым ліку для Беларусі.

Рэфлексія развіцця рэкамендацыйнай бібліяграфіі ва ўмовах лічбавых камунікацый дазваляе вызначыць ролю бібліятэк у інфраструктуры гэтага віду бібліяграфічнай дзейнасці, якая імкліва пашыраецца. Бібліятэкі захоўваюць сацыяльныя арыенціры рэкамендацыйнай бібліяграфіі, прасоўваючы гуманітарныя, культурныя і навуковыя каштоўнасці свету фіксаваных ведаў, і працягваюць глыбінную традыцыю рэкамендацыйнай бібліяграфіі садзейнічаць пашырэнню кругагляду і адукаванасці чалавека. Выкарыстоўваючы лічбавыя тэхналогіі, бібліятэкі і бібліятэчныя прафесійныя арганізацыі ствараюць новую рэкамендацыйную бібліяграфічную прадукцыю, жанры і функцыянал якой адпавядаюць інфармацыйным чаканням сучаснага чалавека і якія гарманізуюцца з формамі рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі, прапанаванай іншымі суб’ектамі лічбавай рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Важна прымяненне бібліятэкамі мультымедыйных і гіпертэкставых тэхналогій, анімацыі, магчымасцей актыўнага ўдзелу карыстальнікаў у ацэнцы кніг, фільмаў, музычных твораў, а таксама зносін з бібліятэкарам і іншымі карыстальнікамі на аснове агульнасці інтарэсаў.

Аднак рэкламаванне бібліятэчнай рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў лічбавым асяроддзі спалучана і з немалымі праблемамі, дыяпазон якіх распасціраецца ад недастатковасці тэхналагічнай аснашчанасці, характэрнай для многіх бібліятэк, да

праблем кадравай падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў. Таму для бібліятэк мае значэнне:

– імклівае пашырэнне інфраструктуры рэкамендацыйнай бібліяграфіі, узнікненне канкурэнтнасці ў адносінах да канчатковых спажыўцоў, уключаючы і шматтысячны сегмент бібліятэк. У сваю чаргу новыя практыкі рэкамендацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці іншых суб’ектаў кніжнай сферы становяцца драйверам развіцця і для бібліятэк;

– выкарыстанне ўсёй лічбавай інфраструктуры, дзе мае месца трансфер рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі. Магчымасць прапановы карыстальнікам іншых (знешніх) каналаў і рэсурсаў пашырае свет фіксаваных ведаў, даступных чытачу. Пры гэтым захоўваецца экспертная роля бібліятэчных спецыялістаў у ацэнцы якасці рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі і дакументальных крыніц;

– тэхналагізм лічбавых камунікацый і шырокі культурны тэкст рэкамендацыйнай бібліяграфіі, што сталі фактарамі абнаўлення бібліяграфічнай прадукцыі і стварэння новых форм (жанраў), у якіх рэкамендацыйная бібліяграфічная інфармацыя разам з графічным афармленнем, відэа- і гукавым суправаджэннем адпавядае медыйнаму ўспрыманню, характэрнаму для мноства сучасных спажыўцоў;

– лічбавыя тэхналогіі і рэкамендацыйная бібліяграфія фарміруюць актыўную чытацкую (глядацкую, слухацкую) анлайн-супольнасць. Краўдсорсінг* рэкамендацыйнай бібліяграфічнай дзейнасці ў лічбавым асяроддзі выводзіць удзел канчатковых карыстальнікаў на новы ўзровень, дасягненне якога было практычна немагчыма ў яе папярэдніх фарматах;

– бібліятэкі Беларусі захоўваюць лідзіруючае становішча ў падрыхтоўцы і распаўсюджванні рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі нацыянальнага дакументнага сегмента. Канкурэнтнасць з боку іншых суб’ектаў лічбавай інфраструктуры яшчэ не стала істотнай. Бібліятэчная рэкамендацыйная бібліяграфія адрозніваецца засваеннем мноства новых жанраў, выяўленай краязнаўчай і беларусазнаўчай арыентацыяй. Складаны шлях лічбавай трансфармацыі, недастатковасць сродкаў бібліятэкары кампенсуюць творчым мысленнем, крэатыўнымі

* Ад англ. *crowd* ‘натоўп’ і *soursing* ‘выкарыстанне рэсурсаў’.

ідэямі, выкарыстаннем бясплатнага лічбавага кантэнту і інструментарыю, актыўным уваходжаннем у сацыяльныя сеткі;

– дарожная карта лічбавай трансфармацыі бібліятэчнай рэкамендацыйнай бібліяграфіі ў Беларусі, на нашу думку, павінна візуалізаваць мэты і задачы яе сістэмы, умацаваць вядучую ролю Нацыянальнай бібліятэкі краіны, якая на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў паступова страчвала некаторыя напрамкі гэтай дзейнасці, значна скараціла ўдзел у стварэнні бібліяграфічнай прадукцыі. У сістэме рэкамендацыйнай бібліяграфіі важна ўзмацненне ўплыву базавага бібліяграфічнага рэсурсу «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку» – яго перавод у лічбавы фармат. Гэта забяспечыла б даступнасць бягучага дакументнага сегмента нацыянальнай друкаванай прадукцыі для карыстальнікаў у глабальных маштабах; зрабіла б магчымым выкарыстанне інавацыйных прыёмаў узаемадзеяння з чытацкай супольнасцю: адпавядала б адной з задач па стварэнні і развіцці электронных інфармацыйных рэсурсаў і забеспячэнні доступу да нацыянальных інфармацыйных рэсурсаў, вызначаных Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі на перыяд 2021–2025 гг.» і накіраваных на развіццё бібліятэчнай галіны.

1. *Брежнева, В. В.* Рекомендательная библиография – новые векторы развития в цифровой среде / В. В. Брежнева // Библиография. – 2020. – № 6. – С. 3–14.

2. *Лопатина, Н. В.* Рекомендательная библиография в информационном обществе / Н. В. Лопатина // Библиография и книговедение. – 2017. – № 2. – С. 53–56.

3. *Решетникова, О. В.* Популярная (рекомендательная) библиография в интернет-среде / О. В. Решетникова // Библиография и книговедение. – 2022. – № 1. – С. 57–64.

4. *Рубанова, Т. Д.* Поддержка чтения в пространстве книжных социальных сетей / Т. Д. Рубанова // Вестн. культуры и искусств. – 2018. – № 3 (55). – С. 45–53.